# МУЗЕЙНЫЯ ПРАПАНОВЫ ДЛЯ СЯМЕЙНАГА НАВЕДВАЛЬНІКА: БЕЛАРУСКІ І ЗАМЕЖНЫ ВОПЫТ

***І. Г. Лупашка,***
*выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

Не выклікае сумненняў, што адна з асноўных задач музея – наладжванне эфектыўных зносін з наведвальнікамі. Сучасныя тэндэнцыі ў развіцці музеяў сведчаць аб неабходнасці пашырэння кірункаў работы, якія б ахоплівалі інтарэсы розных груп насельніцтва. Нягледзячы на вялікую працу беларускіх музеяў у культурна-адукацыйным кірунку, можна заўважыць некаторыя прабелы. На наш погляд, яшчэ не належным чынам наладжана праца з сямейным наведвальнікам. Мяркуем, што далучэнне гэтай катэгорыі да музейнай дзейнасці – важная задача.

Спектр навуковых публікацый па праблеме ўзаемадзеяння музея з сямейным наведвальнікам не вельмі шырокі, аднак існуючыя работы расійскіх і беларускіх даследчыкаў В. Ананьінай, І. Астаўненка, А. Ванславай, Т. Воранавай, Т. Зяленінай, І. Косавай, В. Мірончык, А. Сідаравай і інш. сведчаць аб актуалізацыі гэтага кірунку музейнай дзейнасці. Аналіз айчыннага і замежнага вопыту працы музеяў з сямейнай аўдыторыяй можа спрыяць укараненню станоўчых замежных практык у дзейнасць беларускіх музеяў.

Актуалізацыя форм працы з сям'ёй у музеі патрабуе ўдакладнення дэфініцыі «сямейны наведвальнік». Першапачаткова гэта паняцце ўключала толькі бацькоўска-дзіцячую аўдыторыю (праца вялася з дзецьмі, пачынаючы з 4–5-гадовага ўзросту). Падтрымліваючы думку некаторых расійскіх даследчыкаў, адзначым, што ў апошні час паняцце «сям'я» ў музейным кантэксце пашырылася за кошт уключэння такіх катэгорый наведвальнікаў, як маладажоны, будучыя бацькі і бацькі з дзецьмі ранняга ўзросту (ад 1,5 год), старэйшае пакаленне (бабулі і дзядулі) [6].

На наш погляд, на сучасным этапе можна вылучыць наступныя катэгорыі праграм для сямейнага наведвальніка, якія прапануюць як замежныя, так і беларускія музеі: універсальныя музейныя праграмы, у якіх таксама могуць прымаць удзел



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сем'і; разавыя праекты для сямейнай аўдыторыі; рэгулярныя праграмы, распрацаваныя спецыяльна для сямейнага наведвальніка; сямейныя праграмы, якія рэалізуюцца па папярэдняй замове.

Спынім увагу на спецыяльных прапановах менавіта для сямейнага наведвальніка. Разавыя праграмы звычайна ставяць сваёй мэтай павышэнне цікавасці да музея як месца правядзення вольнага часу і пашырэнне пастаяннай аўдыторыі. Даволі вялікі вопыт у гэтым кірунку назапашаны ў Расіі. Штогод з 2008 г. у Маскве праходзяць «Сямейныя падарожжы», якія адзначаны спецыяльным прызам фестывалю «Інтэрмузей». Аналагічныя праекты праводзяцца і ў іншых рэгіёнах Расіі. Расійскі вопыт пераймалі і беларускія музеі. У 2011 г. сталічнымі літаратурнымі музеямі рэалізаваны праект «Пяць музеяў за пяць тыдняў» – сямейнае падарожжа, якое падрыхтавана для дзяцей ва ўзросце ад 6 да 13 год і дарослых. У 2012 г. адбыўся яшчэ адзін падобны праект – «Музейныя лабірынты», удзел у якім прынялі 10 музеяў г. Мінска. Абраны наступны фармат: самастойная вандроўка па музеі з інтэрактыўным даведнікам, картай і пашпартам удзельніка. Адказы на пытанні можна было знайсці ў экспазіцыях. У праекце прынялі ўдзел больш за 300 каманд, з якіх 128 дайшлі да фінішу, што, на наш погляд, сведчыць аб зацікаўленасці ў адпаведных формах культурна-адукацыйнай дзейнасці [1].

Распаўсюджанай формай работы з сем'ямі ў замежных музеях з'яўляюцца рэгулярныя «праграмы выхаднога дня», якія скіраваны на сацыякультурнае развіццё асобы дзіцяці ў працэсе навучання, сумеснай творчасці і адпачынку разам з бацькамі. Напрыклад, у Талінскім гарадскім музеі адзін раз у месяц праводзіцца «Сямейны дзень»; Музей сучаснага мастацтва ў Франкфурце-на-Майне запрашае сем'і на спецыяльныя праграмы ў другую і чацвёртую нядзелі месяца; Музей натуральнай гісторыі ў Берліне, акрамя штотыднёвых «Дзіцячых нядзель», раз у месяц прапануе сямейныя тэматычныя праграмы «Пасля закрыцця музея» [7; 10; 11]. Большасцю замежных музеяў прапануюцца спецыяльныя сезонныя праграмы для тых, хто знаходзіцца ў адпачынку і на канікулах. На жаль, вопыту правядзення аналагічных сямейных праектаў на рэгулярнай аснове беларускімі музеямі пакуль не назапашана.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Найбольш распаўсюджанымі формамі работы пры правядзенні «праграм выхаднога дня» з'яўляюцца інтэрактыўныя гульні і падарожжы па музеі (як самастойныя, так і ў суправаджэнні спецыяліста), майстар-класы, святы. Такія праграмы разлічаны на сумесную працу дзіцяці і дарослага, які прыйшоў з ім. Кантакт музейнага педагога з дзецьмі будуецца з улікам прысутнасці бацькоў, якіх заахвочваюць актыўна ўдзельнічаць у працэсе заняткаў. Складанасць методыкі такіх заняткаў заключаецца ў наяўнасці двайной спецыфікі, паколькі праца ідзе адначасова і з дзецьмі, і з дарослымі.

Шэраг музейных прапаноў рэалізуецца па папярэдняй замове, што звычайна звязана з арганізацыйнымі асаблівасцямі. Адна з такіх форм – святкаванне ў музеі сямейных урачыстасцей. Такія мерапрыемствы прапануюць наведвальнікам як беларускія, так і замежныя музейшчыкі. Звычайна ў аснове свята ляжыць загадзя распрацаваны сцэнарый, да якога дадаюцца элементы згодна з індывідуальнымі запытамі замоўцы. Значнай колькасцю беларускіх музеяў, у тым ліку рэгіянальных, праводзіцца рэгістрацыя шлюбу. Гэта можа быць як проста ўрачыстая цырымонія ў музейных сценах, так і касцюміраваны тэатралізаваны абрад згодна з тэматычнай скіраванасцю музея (напрыклад, вяселле ў рыцарскім стылі ў Лідскім замку ці рэканструкцыя народных вясельных абрадаў у краязнаўчых музеях). Цікавая праграма «…в Благословенный день, в блаженный мир любви!» распрацавана ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі. Першапачаткова мерапрыемства было адрасавана сямейным парам, якія адзначаюць чарговую гадавіну сумеснага жыцця, зараз створаны варыянт і для тых, хто толькі ўступае ў шлюб [2]. Вельмі запатрабаванай паслугай з'яўляецца такая форма працы, як святкаванне ў музеі дня нараджэння, якая набыла асабліва шырокі размах за мяжой. Пераважна, гэта тычыцца дзіцячых свят. Напрыклад, расійскі Дарвінаўскі музей прапануе тэматычныя дні нараджэння «Суседзі па планеце», «Гіганты, якія зніклі, і не толькі», «Скарбы тропікаў», «Цуд у пер'ях» і інш.; Нямецкі музей тэхнікі ў г. Берліне – «Мара аб палёце», «Прыгоды на караблі», «Поўны наперад» і інш.; Музей мастацтва і рамёстваў г. Гамбурга распрацаваў дзевяць тэматычных праграм, сярод якіх «Тэатр ценяў», «Рыцар і каралева», «Прыгажуні і пачвары» і інш. [3; 9]. Праводзяцца такія святы і беларускімі музеямі (Музейны комплекс гісторыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і культуры Аршаншчыны, Круглянскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей і інш.), хаця, адзначым, што выбар іх не настолькі шырокі. Нацыянальны мастацкі музей Беларусі прапануе наведаць музей і дарослым імяніннікам, для якіх праграма праводзіцца ў філіяле музея «Дом Ваньковічаў». Музей пазіцыяніруе такі дзень нараджэння як «камернае свята для тых, хто хоча перарваць звыклую паўсядзённасць падзеяй» [2].

Багатыя магчымасці для стварэння сямейных музейна-турыстычных праграм маюць музеі-сядзібы і запаведнікі. У якасці прыкладу прывядзем цікавы вопыт Музея-сядзібы Л. М. Талстога «Ясная паляна» (Тульская вобл., Расія). Адукацыйная праграма «Соф’я Андрэеўна запрашае» ўключае наступныя кампаненты: экскурсію па доме Л. М. Талстога «Любімы дом», урокі рукадзелля па методыцы С. А. Талстой, тэатр С. А. Талстой, конную экскурсію «Гісторыя садоў і паркаў Яснай Паляны», наведванне Качакоўскага некропаля, дзе пахавана С. А. Талстая. Іншую скіраванасць мае праграма «Шчасце – гэта быць з прыродай…», якая ўключае прагулкі па малавядомых куточках сядзібы разам з захавальнікам яснапалянскага мемарыяльнага лесу, сядзібныя работы па догляду мемарыяльных ландшафтаў, майстар-клас па народных рамёствах. Акрамя таго, па жаданні наведвальнікаў забяспечваецца пражыванне ў гатэлі «Ясная паляна» і харчаванне ў кафэ з традыцыйнай яснапалянскай кухняй па рэцэптах С. А. Талстой [5]. Мяркуем, што развіццё сямейных праграмм такога кшталту можа стаць перспектыўным і для беларускіх музеяў-сядзіб і запаведнікаў. Гэта стасуецца як з сучаснай тэндэнцыяй пашырэння музейнай прасторы, яе выхаду па-за межы будынка, так і з актыўным развіццём турыстычнай галіны Беларусі.

З мэтай пашырэння сямейнай аўдыторыі музеямі розных краін прадпрымаюцца разнастайныя спосабы яе заахвочвання. Часцей за ўсё гэта магчымасць набыцця ўваходных білетаў па ільготных цэнах. Такая практыка існуе ў многіх замежных музеях. У якасці прыкладу прывядзем маштабную акцыю Ноўгарадскага музея-запаведніка «Сямейная прэм’ера: у выхадны – у музей!», якая з лютага 2013 г. працягвалася да 18 мая 2015 г. Кожны месяц па выхадных 150 наўгародскіх сем’яў з дзецьмі мелі магчымасць наведаць усе музеі, што ўваходзяць у склад Наўгародскага музея-запаведніка, бясплатна [8]. Беларускія музеі робяць першыя спробы падобнага вопыту: Нацыянальны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацкі музей прапаноўвае набыць «сямейны білет» пры ўмове наведвання музея ўсёй сям'ёй (бацькі з адным ці двума дзецьмі).

Гаворачы пра сямейнага наведвальніка музея, неабходна закрануць і такі аспект, як адначасовае наведванне бацькамі і дзецьмі розных музейных мерапрыемстваў. Напрыклад, дарослыя жадаюць наведаць лекцыю, не разлічаную на дзіцячы ўзрост, і на гэты час заняць сваіх дзяцей. У гэтым ракурсе цікавым бачыцца вопыт музея-запаведніка «Гатчына» (Ленінградская вобл., Расія), дзе дзейнічае Дзіцячая гасцёўня (тры пакоі для дзяцей рознага ўзросту), якая працуе ў выхадныя дні. Бацькі могуць пакінуць дзяцей і самастойна аглядаць музей ці наведваць мерапрыемствы. Для дзяцей да 6 год прапануецца традыцыйная гульнёвая прастора. Пакоі для школьнікаў разлічаны на змястоўнае правядзенне вольнага часу, у аснове якога пазнанне праз творчасць і гульню. Матэрыял для заняткаў і гульняў падбіраецца ў адпаведнасці з загадзя вызначанай тэмай і мае непасрэднае дачыненне да профілю музея. Напрыклад, у тэме «Замкі і палацы» прапаноўваюцца такія заняткі: самастойна сабраць замак, пабудаваць сярэднявечны горад, прымерыць рыцарскі шлем і кальчугу, паглядзець гістарычныя фільмы аб жыцці ў сярэднявеччы, прыдумаць свой герб і інш. У дзіцячых пакоях прадугледжана магчымасць хуткай змены інтэр'ера і інфармацыйнага напаўнення. Не пакінулі па-за ўвагай і бацькоў з дзецьмі да 2 год. Ім прапануюцца месцы для калясак і спецыяльныя дзіцячыя пераноскі [4].

Такім чынам, актуальным і перспектыўным кірункам культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў з'яўляецца праца з сямейным наведвальнікам. Арыентуючыся на замежны вопыт, мяркуем, што гэта тэндэнцыя захаваецца і будзе рэалізоўвацца праз пашырэнне форм і метадаў працы з сямейнай аўдыторыяй.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

*1.* Музейныя лабірынты – вандроўка па музеях [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.museumtour.by. – Дата доступу : 16.03.2013.

*2.* Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – 2010–2016. – Рэжым доступу : http://artmuseum.by. – Дата доступу : 16.03.2016.

*3.* Государственный Дарвиновский музей [Электронны рэсурс]. – 1996–2013. – Рэжым доступу : http://www.darwin.museum.ru. – Дата доступу : 20.04.2015.

*4.* Государственный музей-заповедник «Гатчина» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://gatchinapalace.ru. – Дата доступу : 20.03.2016.

*5.* Музей-усадьба Л. Н. Толстого «Ясная Поляна» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://ypmuseum.ru. – Дата доступу : 24.02.2016.

*6. Сидорова, О. В.* Семейная аудитория как объект музейно-педагогической деятельности / О. В. Сидорова // СОЦИС : социол. исслед. – 2011. – № 11. – С. 126–131.

*7.* Таллиннский городской музей [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://linnamuuseum.ee/linnamuuseum/ru. – Дата доступу : 24.02.2016.

*8.* Федеральное государственное бюджетное учреждение культуры «Новгородский государственный объединенный музей-заповедник» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://novgorodmuseum.ru. – Дата доступу : 10.03.2016.

*9.* Museum für Kunst und Gewerbe Hamburg [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.mkg-hamburg.de. – Дата доступу : 15.04.2015.

*10.* Museum für Moderne Kunst Frankfurt am Main [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.mmk-frankfurt.de. – Дата доступу : 15.04.2015.

*11.* Museum für Naturkunde [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.naturkundemuseum-berlin.de. – Дата доступу : 26.03.2016.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПОНЯТИЕ «ВЫСТАВКА» В СОВРЕМЕННОМ МУЗЕЕВЕДЕНИИ

***Е. А. Подорожняя,***

*кандидат исторических наук, кафедра истории Беларуси и музееведения Белорусского государственного университета культуры и искусств*

Понятие «музейная выставка» в современном значении начало складываться с 1920-х гг. До этого времени под выставкой понимали основную экспозицию музея. Появилось данное понятие в связи с тем, что в запасниках музеев из-за нехватки